**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

**ФАКУЛЬТЭТ ГЕАГРАФІІ І ГЕАІНФАРМАТЫКІ**

**БЕЛАРУСКАЕ ГЕАГРАФІЧНАЕ ТАВАРЫСТВА**

**СНДЛ “ГІС-ЛАБАРАТОРЫЯ”**

# «Аб ГІС па-беларуску»

**Універсітэцкі навукова-даследчы семінар,**

**прысвечаны Міжнароднаму дню культуры**

**19 красавіка 2023**

**г. Мінск**

Запрашаем прыняць удзел у першым навукова-даследчым семінары «Аб ГІС па-беларуску», які прысвечаны Міжнароднаму дню культуры. Мерапрыемства заклікана прыцягнуць увагу грамадскасці да геаграфіі і практычнага значэння геаграфічных інфармацыйных сістэм.

Форма ўдзелу: вочная, завочная, дыстанцыйная

Мова: беларуская

Мэта семінара: абмеркаванне актуальных навуковых напрамкаў у галіне геаінфармацыйных сістэм, тэхналогій і сэрвісаў.

Для ўдзелу неабходна:

- Запоўніць рэгістрацыйную форму анлайн да 15.04.2023 г.
- Адправіць тэзісы на электронную пошту bsugislab@gmail.com да 23.04.2023 г.

Праграма семінара будзе сфарміравана на падставе заявак, якія паступілі, і размешчана на сайце Факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ.

**Патрабаванні да тэзісаў**

Аб'ём ад 1 да 2 поўных старонак А4 у фармаце Microsoft Word з пашырэннем .docx. Памеры палёў: верхняе = левае = правае = 2,7 см, ніжняе = 3,4 см, выраўноўванне тэксту па шырыні. Шрыфт: Times New Roman, 14pt. Табліцы і малюнкі не дапускаюцца. Нумараваны спіс крыніц прыводзіцца ў канцы публікацыі і павінен змяшчаць не больш за 5 пазіцый. Аўтаматычная нумерацыя спасылак не дапускаецца.

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору тэзісаў. Аўтары нясуць адказнасць за арыгінальнасць і дакладнасць прадстаўленых матэрыялаў у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

*ПРЫКЛАД*

# АНАЛІЗ МІКРАТАПОНІМАЎ БАРАНАВІЦКАГА РАЁНА МЯСТЭЧАК АМНЕВІЧЫ І ГАРАНАВІЧЫ З ДАПАМОГАЙ ГІС-ТЭХНАЛОГІЙ

**П. С. Гуцько**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*gytko.filip@gmail.com*

Мэтай работы з’яўляецца аналіз мікратапаніміі Баранавіцкага раёна мястэчак Амневічы і Гаранавічы з мэтай выяўлення ролі фактараў прыродных, сацыяльна-эканамічных і этнакультурных на фарміраванне мікратапанікону тэрыторыі. Мікратапонімы – гэта сукупнасць мясцовых геаграфічных назваў невялікіх аб'ектаў (вуліцы, урочышчы і т.д.). А тапаніміка – гэта навука аб геаграфічных назвах: іх паходжанні, сэнсавым значэнні, змяненні (трансфармацыі), напісанні, вымаўленні і перадачы з адной мовы на іншыя. Геаграфічныя назвы – гэта асаблівыя словы, названыя тапонімамі [1].

Тэкст тэкст тэкст ….

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Топонимика: уч-метод. пособие / А.Е. Яротов, А.А. Сазонов, Е.А. Козлов. – Минск: БГУ, 2019. – 168 с.